http://institutemvd.by

УДК 159.9

*С. В. Венідзіктаў*
*нам. начальніка кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*А. М. Калыска*
*курсант 5 курса Магілёўскага інстытута МУС*
*Рэспублікі Беларусь*

# ПСІХАЛАГІЧНАЯ АДАПТАЦЫЯ КУРСАНТАЎ УСТАНОЎ АДУКАЦЫІ СІСТЭМЫ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

Пад сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыяй разумеецца актыўнае засваенне асобай новага сацыяльнага асяроддзя. Адаптаванасць рэалізуецца праз два тыпы рэакцый на ўздзеянне асяроддзя: 1) прыняцце сацыяльных чаканняў, з якімі сустракаецца кожны ў адпаведнасці са сваім полам, узростам, сацыяльным становішчам, і эфектыўны адказ на іх; 2) мабільнасць і эфектыўнасць пры сустрэчы з новым, пры якой чалавек паспяхова карыстаецца створанымі ўмовамі для ажыццяўлення сваіх мэт, рэалізацыі каштоўнасцей і імкненняў.

Значэнне псіхалагічнай адаптацыі ўзрастае ў сітуацыі кардынальнай змены дзейнасці і сацыяльнага асяроддзя чалавека, напрыклад, ва ўмовах атрымання вышэйшай адукацыі ў ведамаснай навучальнай установе закрытага тыпу (сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства абароны). Курсанты ўстаноў адукацыі Міністэрства ўнутраных спраў з першага дня навучання ўваходзяць у сістэму «кіравання / падпарадкавання». Яе спецыфіка, а таксама алгарытмы выканання службовых абавязкаў і рашэння тыповых задач, фарміруюць пэўныя звычкі і стэрэатыпы паводзін, уплываюць на стыль мыслення і тып зносін. Эфектыўнасць прафесійнай падрыхтоўкі курсантаў шмат у чым залежыць ад іх здольнасцей наладжваць канструктыўныя адносіны, пераадольваць камунікатыўныя бар’еры, кантраляваць свой эмацыйны стан.

Даследаванне, праведзенае ў Магілёўскім інстытуце МУС з выкарыстаннем метадаў уключанага назірання і анкетавання, дазволіла вызначыць асноўныя напрамкі псіхалагічнай адаптацыі курсантаў і шляхі яе аптымізацыі.

Псіхалагічная адаптацыя курсантаў у інстытуце пачынаецца з праходжання летняга палявога навучальнага збору. Праведзеныя намі апытанні паказваюць, што найбольшыя складанасці выклікае адаптацыя да рэжыму дня і да сістэмы вайсковай субардынацыі. Распарадак дня аказвае вялікі ўплыў на фізічны і эмацыйны стан курсанта,

прадуктыўнасць вучэбнай дзейнасці, таму пры яго складанні ўлічваецца чаргаванне заканамерных фаз разумовай і рухальнай актыўнасці. Дастаткова складаным з’яўляецца працэс адаптацыі да рэжыму фізічнай падрыхтоўкі. Характэрным для курсантаў першага года навучання з’яўляецца таксама ўзнікненне супярэчнасцей паміж аб’ёмам, навізной, структурай вучэбнага матэрыялу і адсутнасцю навыкаў самастойнай вучэбнай дзейнасці. Маладым людзям неабходна навучыцца слухаць і канспектаваць лекцыі, самастойна вывучаць літаратуру, якасна рыхтавацца да семінарскіх і практычных заняткаў. Такія ж задачы вырашаюць і студэнты “грамадзянскіх” вышэйшых навучальных устаноў, аднак курсанты аказваюцца ў больш жорсткіх умовах: у распарадку дня час як на занятці, так і на самастойную падрыхтоўку строга рэгламентаваны. Курсанты сутыкаюцца з цяжкасцямі і пры засваенні норм і правіл воінскай дысцыпліны: ад іх патрабуецца веданне страявога і дысцыплінарнага статутаў, уменне падпарадкоўвацца. Нарэшце, асаблівасцю навучання з’яўляецца абавязковае нашэнне міліцэйскай формы, што абмяжоўвае магчымасці да знешняга самавыяўлення (на гэты фактар асабліва звяртаюць увагу дзяўчаты-курсанты).

У разгорнутай па часе адаптацыі курсантаў вылучаюцца этапы:

1) азнаямленне: курсант атрымлівае інфармацыю аб новай сістэме, крытэрыях ацэнкі розных дзеянняў, аб эталонах і нормах паводзін (выбар навучальнай установы, летні палявы збор, першы семестр);

2) Прыстасаванне: курсант пераарыентоўваецца, прызнаючы галоўныя элементы новай сістэмы каштоўнасцей, але захоўвае многія ранейшыя ўстаноўкі (другі семестр першага года навучання);

3) асіміляцыя і акамадацыя: прыстасаванне да асяроддзя, ідэнтыфікацыя з новай групай, а таксама пераўтварэнне асяроддзя, прыпадабненне да сябе.

Фактары, якія ўплываюць на паспяховасць праходжання адаптацыйных працэсаў, можна падзяліць на дзве групы: аб’ектыўныя і суб’ектыўныя. У якасці аб’ектыўных выступаюць вучэбная праграма, жыллёвыя і побытавыя ўмовы, сістэма размеркавання адпачынку і вольнага часу, грашовае і матэрыяльнае забеспячэнне. Суб’ектыўнымі (індывідуальнымі для кожнага канкрэтнага курсанта) фактарамі з’яўляюцца біяграфічныя асаблівасці (асяроддзе і метады выхавання, склад сям’і, узровень адукацыі бацькоў), узровень падрыхтоўкі да навучання ў інстытуце (матывацыя да паступлення, ступень разыходжання рэальных і ідэальных (да паступлення) уяўленняў аб навучанні), псіхалагічныя асаблівасці (узровень прэтэнзій і самаацэнка, камунікатыўныя і агульныя адаптыўныя здольнасці, скіраванасць асобы, каштоўнасныя арыентацыі, наяўнасць пэўных асобасных рыс).

Прыкметамі малаэфектыўнай адаптацыі (дэзадаптацыі) курсантаў з’яўляюцца зніжэнне працаздольнасці, стомленасць, галаўныя болі,

дамінаванне прыгнечанага настрою, узрастанне ўзроўню трывожнасці, млявасць ці, наадварот, гіперактыўнасць, што суправаджаюцца парушэннямі дысцыпліны, сістэматычным невыкананнем заданняў, адсутнасцю матывацыі да вучэбнай дзейнасці, хранічнай непаспяховасцю, некантактнасцю. Для дэзадаптыўных паводзін таксама тыповымі з'яўляюцца няўпэўненасць у будучыні, адсутнасць ініцыятывы. Названыя праблемы найбольш востра выяўляюцца на працягу першага семестра навучання ў інстытуце, што звязана з працэсам актыўнага ўключэння ў новае асяроддзе, зменай мадэлей паводзін, фарміраваннем новых звычак.

Псіхалагічная адаптацыя курсантаў можа мець стыхійны, некантралюемы характар, прыводзячы да праяў асобага тыпу прафесійнай дэфармацыі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Прафдэфармацыя асобы курсантаў – вынік скажэння прафесійных якасцей навучэнцаў пад уплывам адмоўных фактараў дзейнасці, вучобы і навакольнага асяроддзя, выпрацоўкі негатыўнага стэрэатыпу паводзін. Курсанты штодня знаходзяцца ва ўмовах, прадыктаваных нормамі розных статутаў, палажэнняў, а таксама волевыяўленнем старэйшых па званні. Гэта абумоўлівае адхіленні ад «ідэальнай» мадэлі паводзін курсанта і змяненні ў стэрэатыпах дзейнасці ў розных сферах жыцця. Прафдэфармацыя курсантаў у далейшым прадвызначае недастаткова якаснае выкананне імі абавязкаў падчас службы ў тэрытарыяльных аддзелах унутраных спраў.

Магчымымі напрамкамі прафілактыкі прафесійнай дэфармацыі ў асяроддзі курсантаў, на наш погляд, з'яўляюцца: 1) аптымізацыя мадэлей узаемадзеяння курсантаў паміж сабой, а таксама з афіцэрамі і прафесарска-выкладчыцкім складам; 2) правядзенне псіхалагічных трэнінгаў у складзе навучальных груп; 3) адкрытае абмеркаванне агульных праблем і калектыўны пошук іх рашэнняў, што будзе спрыяць усталяванню адносін даверу і зніжэнню ўзроўню канфліктнасці; 4) фарміраванне станоўчага вобразу супрацоўніка міліцыі і сілавых структур у цэлым, што актывізуе імкненне курсантаў да развіцця станоўчых якасцей і самаўдасканалення; 5) дыферэнцыраваны падыход у прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці, які фарміруе негатыўнае стаўленне да парушэння службовай дысцыпліны; 6) укараненне новых методык і тэхналогій навучання, мадэліраванне нестандартных сітуацый і пошук іх вырашэння, што садзейнічае набыццю якасна іншых ведаў, уменняў і навыкаў.

Такім чынам, ва ўстановах вышэйшай адукацыі сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў працэс псіхалагічнай адаптацыі звязаны як з агульным змяненнем характару сацыяльнай актыўнасці і пазнавальнай дзейнасці курсантаў, так і з неабходнасцю інтэграцыі ў іерархічна пабудаваную і строга рэгламентаваную сістэму органаў

унутраных спраў. Паспяховым дадзены працэс можна назваць у тым выпадку, калі да сканчэння першага года навучання курсант авалодвае навыкамі эфектыўнай вучэбнай і службовай дзейнасці, засвойвае сістэму субардынацыі, набывае ўстойлівасць да ўздзеяння стрэсавых фактараў і ўспрымае выбар прафесіі як усвядомлены валявы акт. Пры гэтым мінімізацыя магчымых негатыўных асобасных змяненняў у асяроддзі супрацоўнікаў органаў унутраных спраў будзе спрыяць аптымізацыі дзейнасці па барацьбе з правапарушэннямі.

УДК 796

*А. А. Глазырин*
*зам. начальника кафедры профессионально-прикладной физической подготовки Академии МВД Республики Беларусь, кандидат педагогических наук, доцент*
*А. Н. Новиков*
*преподаватель кафедры профессионально-прикладной физической подготовки Академии МВД Республики Беларусь*

## ПУТИ ПОВЫШЕНИЯ УРОВНЯ ФИЗИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВЛЕННОСТИ АБИТУРИЕНТОВ АКАДЕМИИ МВД РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Одним из важных слагаемых гармоного развития молодого поколения нашей страны является физическое воспитание, приобретающее важное значение для организации профессиональной подготовки кадров для органов внутренних дел. Данная подготовка определяет ориентацию содержания на развитие личностного роста субъекта и выступает интегративной частью специального профессионального образования.

В соответствии с квалификационной характеристикой специалиста выпускника учреждения образования «Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь» (далее – Академия МВД) по дисциплине «Профессионально-прикладная физическая подготовка» (далее – ППФП) выпускник должен владеть специальными двигательными умениями и навыками, определенным уровнем развития основных физических качеств (силы, быстроты, выносливости, ловкости), навыками применения приемов самозащиты без оружия, приемами самоконтроля и саморегуляции в процессе служебной деятельности.

Физическое воспитание в силовых ведомствах из-за своего прикладного характера рассматривается как предмет профессионального обучения и воспитания личного состава в форме целостного процесса профессиональной подготовки.